ДУ «ВІЦЕБСКАЯ АБЛАСНАЯ БІБЛІЯТЭКА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА»

Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

Інфармацыйнае паведамленне

II КВАРТАЛ

Віцебск 2020

ГУ "ВИТЕБСКАЯ ОБЛАСТНАЯ БИБЛИОТЕКА ИМ. В. И. ЛЕНИНА"
Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

II квартал

2020

Інфармацыйнае паведамленне

ВІЦЕБСК
2020

УДК 008
ББК 71.41(4Беи–4Вит)
К90

Складальнікі *Л. І. Рагачова, Т. В. Пацалуёнак*
Рэдактар *К. Д. Яскевіч*
Адказны за выпуск *Т. М. Адамян*

Культурнае жыццё Віцебскай вобласці : II квартал 2020 года : інфармацыйнае паведамленне / ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», Аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі ; [склад. Л. І. Рагачова, Т. В. Пацалуёнак]. – Віцебск, 2020. – 50с.

Штомесячнае інфармацыйнае паведамленне разлічана на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне.

Прызначана для спецыялістаў інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і іншых катэгорыяў карыстальнікаў.

© ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна», 2020

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

II квартал 2020

Інфармацыйнае паведамленне

Складальнікі Рагачова Ларыса Іванаўна, Пацалуёнак Таццяна Віктараўна,
Адказны за выпуск Т. М. Адамян
Камп'ютарная вёрстка А. В. Юпатавай

Надрукавана на ксераксе ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»
210601, г. Віцебск, вул. Леніна, д. 8а
E-mail: kray@vlib.by, vlib@vlib.by

ПРАДМОВА

«Культурнае жыццё Віцебскай вобласці» – штомесячнае інфармацыйнае паведамленне, разлічанае на сістэматычнае інфармаванне кіраўнікоў, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва горада і вобласці аб развіцці галіны культуры на Віцебшчыне. Выданне можа быць карысным спецыялістам інфармацыйных цэнтраў, культурна-асветных устаноў, краязнаўцам, выкладчыкам, студэнтам і іншым катэгорыям карыстальнікаў.

Пастаянная рубрыка «Хроніка падзей» уключае аналітычна перапрацаваную інфармацыю, падрыхтаваную па матэрыялах абласной газеты «Витебские вести», гарадскіх і раённых газет Віцебскай вобласці за перыяд з 1 красавіка па 30 чэрвеня 2020 года, і ўтрымлівае звесткі, прадастаўленыя Віцебскім абласным метадычным цэнтрам народнай творчасці і цэнтральнымі бібліятэкамі вобласці.

КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

КУЛЬТУРА

АГУЛЬНЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТУРЫ

Патрыятычная акцыя «**Дарогамі памяці**», прысвечаная 75-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, сярод аўтаклубаў Віцебскай вобласці пачалася **8 красавіка** з Дубровенскага раёна. Акцыя праводзілася ў мэтах героіка-патрыятычнага выхавання насельніцтва, вывучэння і папулярызацыі рэгіянальных помнікаў, увекавечання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр вайны. Арганізатарамі выступілі ДУ «Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці» і аддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі (аддзелы культуры) гаррайвыканкамаў.

Падчас правядзення акцыі супрацоўнікі і калектывы мастацкай творчасці аўтаклубаў выязджалі на месцы баявой славы Віцебшчыны, добраўпарадкавалі помнікі невядомым салдатам, месцы воінскіх пахаванняў, праводзілі экскурсіі з наведваннем музеяў, мітынгі і іншыя тэматычныя мерапрыемствы, накіраваныя на зберажэнне памяці пра гераічныя подзвігі абаронцаў Айчыны.

Прадстаўнікі Лёзненскага раёна, вызваленага першым у Віцебскай вобласці – 8 кастрычніка 1943 года, на тэрыторыі якога знаходзяцца больш за 80 воінскіх пахаванняў і 600 помнікаў і абеліскаў, завяршылі абласную акцыю «Дарогамі памяці» ў ліпені 2020 года. Агонь Памяці, кнігі «Памяць» і карты помнікаў кожнага раёна, перададзеныя па эстафеце з аднаго раёна ў другі, у хуткім часе стануць экспанатамі Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ганаровае званне «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь» прысвоена артысту драмы,

Мерапрыемствы, якія не ўвайшлі ў папярэдні выпуск

12–13 сакавіка на базе Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь адбыўся I Рэспубліканскі краязнаўчы форум Беларусі, прысвечаны Году малой радзімы. Ва ўрачыстай абстаноўцы прайшло ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу краязнаўчай літаратуры. Гран-пры прысуджаны **Ігару Міхайлавічу Пракаповічу** з Пастаў за серыю кніг краязнаўчай тэматыкі, актыўны ўдзел у папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны, за значны ўклад у развіццё краязнаўства Беларусі. (*Пастаўскі край. – 2020. – 1 крас. – С. 1.*)

ФОТАМАСТАЦТВА

У **красавіку** адна з самых тытулаваных беларускіх фатографаў Дар'я Ерамеева (Матросава) з Віцебска выйграла конкурс Федэрацыі Еўрапейскіх Фатографаў і атрымала тытул «Лепшы фатограф Еўропы-2020». Для ўдзелу ў конкурсе былі прадстаўлены работы серыі «Акцэнты і формы».

ХАРЭАГРАФІЯ

У красавіку Віцебскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці выдаў кнігу «Прыдзвінскія карункі (Народная танцавальная спадчына Віцебшчыны)». У кнізе сабрана змястоўная інфармацыя пра бытаванне танцавальнага фальклору, развіццё народнай харэаграфіі на Віцебшчыне, пра вядомых харэографаў і лепшыя фальклорныя калектывы вобласці.

КІНАМАСТАЦТВА

Напярэдадні Дня Перамогі ў Талачынскім Цэнтры культуры і народнай творчасці адбылася прэм'ера дакументальнага фільма «Андрей Усов», знятага рэжысёрам народнай кінастудыі «Летапіс» Дзмітрыем Іўчанка. Стужка прысвечана франтавомуі пасляваеннаму лёсу легендарнага танкіста.

вядучаму майстру сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа **Георгію Мікалаевічу Лойку**.

Ганаровага звання «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь» удастоена намеснік генеральнага дырэктара па спецыяльных праектах Цэнтра культуры «Віцебск» **Марына Генадзеўна Раманоўская.**

Ганаровае званне «Віцябчанін года» ў 2020 годзе ў намінацыі «Падзея года» прысвоена за дасягненне высокіх вынікаў фатографу, мастаку, члену Беларускага саюза дызайнераў **Дар'і Аляксандраўне Ерамеевай (Матросавай).**

Ганаровае званне «Віцябчанін года» ў 2020 годзе ў намінацыі «Дэбют года» прысвоена за высокі прафесіяналізм, вялікі асабісты ўклад у правядзенне на высокім арганізацыйным і творчым узроўні значных грамадскіх і культурных мерапрыемстваў горада Віцебска дырэктару дзяржаўнай установы «Культурна-дзелавы цэнтр "Першамайскі"» **Ірыне Міхайлаўне Краўчанка**.

Ганаровае званне «Віцябчанін года» ў 2020 годзе ў намінацыі «Грамадскае прызнанне» прысвоена за актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні грамадска-значных культурна-масавых мерапрыемстваў, канцэртаў, мерапрыемстваў Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» загадчыку філіяла «Канцэртная зала "Віцебск"» дзяржаўнай установы культуры «Цэнтр культуры "Віцебск"» **Уладзіміру Мікалаевічу Варанецкаму.**

Па выніках 2019 года на Дошку Гонару Чыгуначнага раёна г. Віцебска занесена мастацкі кіраўнік Палаца культуры «Руба» **Іна Кліменка**.

Прэміямі Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў па выніках 2019 года адзначаны навучэнцы ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў сферы культуры, якія з'яўляюцца пераможцамі міжнародных, рэспубліканскіх, абласных творчых конкурсаў. Сярод іх выхаванцы Віцебскага дзяржаўнага музычнага каледжа імя І. І. Салярцінскага

Фёдар Крукоўскі, Дзмітрый Дзявятнікаў, Леанід Арцем'еў, Дзмітрый Дзеўгуць, Лізавета Засімовіч.

Ганаровая Грамата Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта ўручана кіраўніку народнага фальклорнага калектыву «Крыніца» Янкавіцкага СДК **Надзеі Кавалёвай**. У 2020 годзе народны калектыў адзначыў сваё 20-годдзе, з'яўляецца адным з культурных брэндаў Расоншчыны.

КУЛЬТУРНЫЯ СУВЯЗІ

18 чэрвеня г. Глыбокае наведаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Дзяржавы Ізраіль у Рэспубліцы Беларусь Алон Шогам разам з удзельнікамі прома-тура «Страчаны рай: жыццё і катастрофа беларускіх штэтлаў». Мэта прома-тура – знаёмства з жыццём былых яўрэйскіх мястэчак, наведванне музеяў і мемарыяльных комплексаў, пахаванняў і памятных месцаў, звязаных з гісторыяй яўрэйскага насельніцтва Глыбоцкага, Докшыцкага і Ушацкага раёнаў. Адбылося ўрачыстае адкрыццё памятнага знака на месцы, дзе раней размяшчаўся сінагагальны комплекс яўрэйскай абшчыны.

26 чэрвеня Бешанковіччына адзначыла 76-ю гадавіну вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. На мемарыяльным комплексе «Узрэчча» адбыўся мітынг-рэквіем. Даніну павагі і памяці героям-вызваліцелям аддалі ўдзельнікі мерапрыемства ля брацкай магілы ў в. Саннікі. З ганаровай місіяй прыехаў дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, вядомы тэлежурналіст Тэнгіз Думбадзэ. Ён прывёз на магілу, дзе пахаваны Герой Савецкага Саюза Мірза Гелавані, зямлю з радзімы паэта – Тыянецкага муніцыпалітэта Грузіі. У гэты дзень адбылося падпісанне Мемарандума аб гандлёва-эканамічным, сацыяльным і культурным супрацоўніцтве паміж Бешанковіцкім раёнам і Тыянецкім муніцыпалітэтам Грузіі. Гэтая падзея адбылася дзякуючы арганізаванаму тэлемосту «Бешанковічы – Тыянеці».

У чэрвені ў Мазалаўскім СДК Віцебскага раёна экспанавалася выстава работ майстра народных мастацкіх рамёстваў (разьба па дрэве) і мастака-аматара Аляксандра Захарчанкі.

Новую форму далучэння да вытокаў беларускай культуры прапанаваў Наваполацкі Цэнтр рамёстваў і традыцыйнай культуры. Кожную пятніцу праходзілі майстар-класы па народных рамёствах у сацыяльных сетках.

ТЭАТРАЛЬНАЕ ЖЫЦЦЁ

Май–чэрвень. Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа арганізаваў штодзённыя трансляцыі рэпертуарных спектакляў ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте». Унікальныя запісы пастановак мінулых гадоў былі даступныя для прагляду з 8 да 23 гадзін.

Народны тэатр Браслаўскага РДК зняў кінаспектакль па матывах фільма «Служебный роман». **Напрыканцы мая** першыя серыі фільма пачалі выкладваць на відэахостынгу YouTube.

9 чэрвеня артысты Беларускага тэатра «Лялька» прадставілі вулічную прэм'еру інтэрактыўна-пазнавальнага прадстаўлення «Лялечны карагод». Стварылі новую пастаноўку з фокусамі, загадкамі, рознымі відамі лялек мастацкі кіраўнік тэатра Віктар Клімчук і вядучы майстар сцэны Вольга Маханькова.

30 чэрвеня на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа адбылася прэм'ера камедыі-фарса «Каханне і падаткі» па п'есе Уільяма Ван Зандта і Джэйн Мілмар «Сэкс, каханне і налогі». Рэжысёр-пастаноўшчык і перакладчык п'есы – мастацкі кіраўнік Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра Ганна Мушперт, мастак-пастаноўшчык – Святлана Макаранка.

27 чэрвеня ў Віцебскай абласной філармоніі адбылася музычна-гульнявая праграма «Карамелька и горошинка на Карибских островах». Праграма ўпершыню прадстаўлена ў фармаце open-air ва ўнутраным дворыку філармоніі.

«Пересечение» – пад такой назвай адкрылася персанальная выстава твораў мастака Аляксея Пшонкі ў Лепельскім Цэнтры рамёстваў.

ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА

5 красавіка ў Глыбоцкім цэнтры традыцыйнай культуры і народнай творчасці адкрылася персанальная выстава майстра раённага Дома рамёстваў Валянціны Логвін «Лапікавая мазаіка». На выставе прадстаўлены пакрывалы, карціны, цацкі, пано.

Майстар Шаркаўшчынскага раённага Цэнтра рамёстваў Ала Леднік стварыла пано, прысвечанае гераічнай славе роднага краю. На пано нанесены месцы пахаванняў вайскоўцаў, партызан, мірных жыхароў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

У маі ў Глыбоцкім Доме рамёстваў адкрылася выстава «З бабулінага куфра». На экспазіцыі размешчаны посцілкі-кілімы, паясы, дарожкі, ручнікі.

1–11 чэрвеня ў Дубровенскім раённым Доме рамёстваў праходзіла выстава лапікавага шыцця. У экспазіцыі былі прадстаўлены сурвэткі, коўдры, падушкі, пано і інш. Галоўны экспанат – унікальная коўдра, выкананая ў тэхніцы лапікавай мазаікі і адноўленая майстрамі ў 2004 годзе.

У чэрвені ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці адкрылася персанальная выстава дырэктара Бешанковіцкага Дома рамёстваў Алесі Аўчыннікавай. На выставе прадстаўлены работы ў розных тэхніках: тэматычныя кампазіцыі, падсвечнікі, свістулькі з керамікі, роспіс па шкле.

Народны клуб аматараў лапікавага шыцця «Рошва» Полацкага Цэнтра рамёстваў і нацыянальных культур завяршыў рэалізацыю мастацка-патрыятычнага праекта «Открытка ко Дню Победы», прысвечанага 75-годдзю Перамогі. Палатно «Живи, Победа!» складзена з 65 тэкстыльных паштовак з розных гарадоў Беларусі і Расіі.

КУЛЬТУРНА-АСВЕТНАЯ РАБОТА. САЦЫЯКУЛЬТУРНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У СФЕРЫ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

5 чэрвеня ў Полацку былі праведзены традыцыйныя мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня памяці Прападобнай Еўфрасінні Полацкай. Установы культуры горада і творчыя калектывы прынялі актыўны ўдзел у правядзенні свята. На адкрытых пляцоўках прайшлі тэматычныя канцэрты творчых калектываў, літаратурна-музычныя кампазіцыі, духоўна-асветніцкія праекты.

КЛУБНАЯ СПРАВА

Цэнтр культуры і творчасці Віцебскага раёна **да 30 красавіка** праводзіў трансляцыю канцэртаў самадзейных артыстаў у сацыяльных сетках у анлайн-рэжыме.

1 красавіка адзначыў 20-гадовы юбілей узорны дзіцячы тэатр «Вясёлка» (кіраўнік Людміла Сасніцкая) Палаца культуры г. Барані Аршанскага раёна. Напярэдадні юбілею ў тэлепраграме «Вечерний Витебск» быў паказаны ўрывак са спектакля «Сказ про Бездельницу Царевну» ў пастаноўцы калектыву, які неаднаразова перамагаў у абласных і міжнародных фестывалях і конкурсах. **У маі** тэатр «Вясёлка» ўдзельнічаў у анлайн-конкурсах і стаў уладальнікам лаўрэацкіх званняў Усерасійскага конкурсу-фестывалю творчасці і мастацтваў «75 лет Великой Победы» і I Усерасійскага тэатральнага конкурсу-фестывалю «Его Величество – Театр».

3 красавіка супрацоўнікі Браслаўскага РЦК запусцілі анлайн-праект «Культурный контент», да праекта далучыліся Браслаўская і Відзаўская ДШМ, раённае аб’яднанне музеяў, ЦБС раёна. На канале «Браслав. Культура. Онлайн» на відэахосцінгу YouTube выкладваліся відэа канцэртных нумараў, урыўкі са спектакляў, фотапраекты, майстар-класы.

Полацкі раённы Цэнтр культуры **ў красавіку** правёў анлайн-фотаконкурс «#ПАСХАдома». Штодзень раённы цэнтр прадстаўляў на

сваёй старонцы новыя серыі праекта «Відэаэнцыклапедыя», дзе расказваў пра цікавыя факты і падзеі.

Цэнтр культуры «Віцебск» **у красавіку** запусціў флэшмоб #ЦКНАСВЯЗИ і на сваёй старонцы ў сацсетках размяшчаў відэаролікі з выступленнямі творчых калектываў цэнтра, трэніровак і рэпетыцый ў анлайн-фармаце.

У красавіку работнікі Капцянскага СДК Віцебскага раёна стварылі відэапраект «Для души», правялі анлайн-канцэрт для людзей пажылога ўзросту, разам з мясцовымі бібліятэкай і школай запусцілі анлайн-конкурс вершаў «Поэтический Герой».

У зале Шаркаўшчынскага раённага Цэнтра рамёстваў адбыўся творчы вечар фальклорнага гурта «Калядзіца». Кіруе калектывам удзельніц сталага ўзросту метадыст Цэнтра рамёстваў А. Сухаверская. Калектыў падрыхтаваў традыцыйныя бытавыя танцавальныя нумары і беларускія песні. Са сцэны гучалі казкі, прымаўкі, прыпеўкі і вясёлыя апавяданні. (*Кліч Радзімы. – 2020. – 18 крас. – С. 6.*)

У маі супрацоўнікі Полацкага раённага Цэнтра культуры праводзілі акцыю «Музыкально-поздравительная открытка “Победа в окнах”». Удзельнікі творчых калектываў арганізавалі для ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны канцэрты-віншаванні з выездам на дом.

Да 75-годдзя Перамогі Цэнтрам культуры і народнай творчасці Пастаўскага раёна праведзены інтэрнэт-конкурс відэаролікаў «И память сердца говорит». Пераможцам стаў Курапольскі СДК.

У маі аўтаклуб Віцебскага раёна рэалізаваў пілотны праект «Дарогамі Перамогі» і прыняў удзел у рэспубліканскім патрыятычным праекце «Кветкі Вялікай Перамогі». Сумесна з райкамам БРСМ былі арганізаваны выязныя канцэрты для ветэранаў вайны, малалетніх вязняў, блакаднікаў.

У маі супрацоўнікі Асвейскага ГДК Верхнядзвінскага раёна арганізавалі выязныя віншаванні ветэранаў вайны і былых малалетніх вязняў.

ВЫЯЎЛЕНЧАЕ МАСТАЦТВА

У красавіку ў выставачнай зале Віцебскага абласнога краязнаўчага музея адкрылася выстава работ народнага клуба мастакоў-аматараў «Контур», які дзейнічае пры Культурна-гістарычным комплексе «Залатое кальцо горада Віцебска “Дзвіна”», пад назвай «Сказки нашего клуба».

У Браслаўскім музеі традыцыйнай культуры адкрылася выстава самадзейнай мастачкі Аліны Трукан «Мае сны». Сёлета работа мастачкі прадстаўлена на Фестывалі акварэлі ў Італіі.

У **красавіку** ў Лепельскім раённым краязнаўчым музеі праходзіла выстава жывапісу земляка, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Фёдара Бурцава.

У **красавіку–маі** ў музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка экспанавалася выстава дыпломных работ студэнтаў мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава пад назвай «Творчы дэбют».

14 мая ўпершыню ў анлайн-прасторы адкрыўся гарадскі выставачны праект «Мастак і горад». Ужо 9 год экспазіцыя праекта адкрываецца на плошчы Якуба Коласа ў Мінску. У гэтым годзе выстава прысвечана 100-годдзю творчага аб’яднання «УНОВИС». Праект рэалізуецца Мемарыяльным музеем-майстэрняй Заіра Азгура сумесна з камунікацыйнай кампаніяй GBS і музеем «Віцебскі цэнтр сучаснага мастацтва».

У Віцебскім мастацкім музеі **ў чэрвені** дзейнічала выстава «Творчество как образ жизни», прысвечаная 60-годдзю мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава. Аўтары работ – педагогі дзіцячых школ мастацтваў Полацка і Наваполацка, якія з’яўляюцца выпускнікамі факультэта.

У чэрвені ў Гарадоцкім раённым краязнаўчым музеі экспанавалася мастацкая выстава «Минувших лет живая память», на якой былі прадстаўлены работы беларускіх мастакоў, выкананыя ў розных жанрах і тэхніках.

МАСТАЦТВА

Навучэнцы Шумілінскай ДШМ заваявалі 10 дыпломаў на IV Міжнародным конкурсе-фестывалі шматжанравага мастацтва «Я выбираю свой путь», які праходзіў завочна, і запрошаны да ўдзелу ў XI Міжнародным конкурсе-фестывалі сцэнічнага і мастацкага майстэрства, які пройдзе ў студзені 2021 года ў Маскве.

Выдатных вынікаў на міжнародных анлайн-конкурсах дабіўся скрыпічна-фартэпіянны ансамбль «Вясёлыя ноткі» ДШМ № 3 г. Наваполацка. Калектыў стаў лаўрэатам I ступені ў намінацыі «Інструментальная творчасць» I Міжнароднага конкурсу «Dilly Melody» (г. Санкт-Пецярбург), лаўрэатам II ступені VII Міжнароднага конкурсу «AVANTI» (г. Мінск); лаўрэатам II ступені праекта «Spring Contest 2 of XVI International Culture Caravan 2020» (г. Волін, Польшча). Лаўрэатамі I ступені на конкурсе «Dilly Melody» сталі гурт «Viva musica» і трыа «Экспромт» ДШМ № 3 г. Наваполацка.

23 з 24 магчымых балаў на Міжнародным дзіцячым конкурсе «Sternchen zu Hause» (г. Мюнстэр, Германія) атрымала навучэнка ДШМ № 1 г. Наваполацка Анастасія Васюкевіч і стала лаўрэатам I ступені.

Навучэнец Лепельскай дзіцячай школы мастацтваў Ілля Зайцаў паказаў высокі ўзровень выканальніцкага майстэрства і стаў лаўрэатам II ступені III Міжнароднага конкурсу выканальніцкіх відаў мастацтваў «Сябры-2020» (**16–17 мая**, г. Мінск), у якім удзельнічалі прадстаўнікі Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Славеніі.

У гонар вядомага беларускага кампазітара Мікалая Пятрэнкі ў Полацкім педагагічным каледжы прайшоў XX юбілейны конкурс маладых выканаўцаў. Сёлета конкурс змяніў фармат на дыстанцыйны. Відэаматэрыялы з выступленнямі прадставілі 28 выканаўцаў і 12 калектываў Віцебшчыны.

У маі супрацоўнікі Бігосаўскага СДК Верхнядзвінскага раёна правялі выязныя канцэрты-віншаванні ветэранаў вайны і былых малалетніх вязняў. Напярэдадні Дня Перамогі ў выкананні артыстаў Бігосаўскага СДК прагучаў радыёканцэрт «Жывая памяць».

У маі супрацоўнікі Каханавіцкага СДК Верхнядзвінскага раёна правялі мерапрыемствы да 75-годдзя Перамогі – канцэрт «Минувших дней святая память» на пляцоўцы ля Дома культуры і міні-канцэрт у в. Першамайская «Годы уходят, но память жива».

«Сквозь годы гремит Победа» – мерапрыемства пад такой назвай было праведзена **ў маі** ў Мазалаўскім СДК Віцебскага раёна.

«Адчуйце нашу любоў на адлегласці» – канцэрт-анлайн пад такой назвай падрыхтавалі работнікі Міёрскага РДК.

13 чэрвеня адбылася анлайн-сустрэча, прысвечаная культуры Паўднёвай Карэі, арганізаваная філіялам «Цэнтр нацыянальных культур» Цэнтра культуры «Віцебск» у рамках анлайн-праекта «Исскуство не имеет границ».

21 чэрвеня да Міжнароднага дня бацькі ў г. Глыбокае былі рэалізаваны два творчыя інтэрнэт-праекты: «Любимым папам посвящается», дзе ўсе жадаючыя маглі павіншаваць сваіх татаў малюнкамі, відэазваротамі, якія былі размешчаны ў групе «Молодежь Глуботчины» ВКонтакте, і «Нам любое дело с папой по плечу!», дзе размяшчаліся сумесныя фотаздымкі дзяцей і татаў. У праекце прынялі ўдзел супрацоўнікі Глыбоцкага ГДК і Глыбоцкага Цэнтра народнай творчасці.

27 чэрвеня калектыў Бешанковіцкага раённага Цэнтра культуры арганізаваў у гарадскім парку райцэнтра канцэрт «За намі будучае» з нагоды Дня моладзі.

Народны ансамбль беларускай песні «Невида» Фарынаўскага Цэнтра культуры і вольнага часу Полацкага раёна адзначаны прэстыжнымі дыпломамі. За відэаверсію песні «Дамоў» калектыў удастоены Гран-пры двух міжнародных конкурсаў: «Звездопад-2020» у намінацыі «Народныя спевы» і «Грани творчества-2020» у намінацыі «Музыка ў маім жыцці».

ФЕСТЫВАЛІ, СВЯТЫ, КОНКУРСЫ

Міжнародны конкурсны праект сучаснага мастацтва і крэатыўнай творчасці лАпельсиновая береза», які шэсць гадоў запар праводзіўся ў Оршы, прайшоў у новым фармаце – І Міжнародны шматжанравы фестываль-конкурс краін Расіі і Беларусі «Апельсиновая береза онлайн». Вынікі былі падведзены на анлайн-канцэрце **1 чэрвеня.** Гран-пры атрымала загадчык Сасноўскага сельскага клуба Віцебскага раёна Кацярына Забабурына за творчую работу «Дрэва сяброўства», выкананую ў змешанай тэхніцы. Дыпломамі лаўрэатаў І ступені ўзнагароджаны таксама прадстаўнікі Віцебскага раёна: кіраўнік гуртка Тулаўскага СДК Марыя Шаўрова і навучэнцы Старасельскай ДШМ Марыя Волкава, Ксенія Мацвеева, Вікторыя Гарбунова. Удзельніца ўзорнага тэатра «Вясёлка» Палаца культуры г. Барані Паліна Рыбакова стала лаўрэатам ІІІ ступені ў намінацыі «Мастацкае слова».

5 чэрвеня ў Гарадку адбылася арт-сустрэча «На крылах натхнення», прысвечаная 165-годдзю з часу напісання паэмы Канстанціна Вераніцына «Тарас на Парнасе». У сустрэчы прынялі ўдзел супрацоўнікі Гарадоцкага раённага краязнаўчага музея, Гарадоцкага філіяла «Дом рамёстваў і фальклору» Цэнтра традыцыйнай культуры, народны ансамбль песні «Суседзі» Даўгапольскага сельскага клуба.

Народны клуб самадзейных паэтаў «Вдохновение»_Расонскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці адзначаны Дыпломам лаўрэата ІІ ступені на абласным конкурсе чытальнікаў, прысвечаным 75-годдзю Вялікай Перамогі. На конкурс была прадстаўлена літаратурна-музычная кампазіцыя «Памяць жыве на расонскай зямлі».

22–30 чэрвеня супрацоўнікі Сенненскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці арганізавалі інтэрнэт-акцыю «Пусть свечи памяти горят». У рамках акцыі ўсе жадаючыя маглі прыняць удзел у паэтычным флэш-мобе «Война. Победа. Память» з відэазапісамі вершаў на ваенную тэму. Вынікі акцыі размяшчаліся на старонках РЦКіНТ у сацыяльных сетках.

11 чэрвеня адбылася прэзентацыя архітэктурнай канцэпцыі эскіза будаўніцтва Сафійскага сабора ў Віцебску. Месца будаўніцтва – на беразе заходняй Дзвіны ў раёне ГЦ «Беларусь». Галоўны архітэктар праекта – Ігар Радзько. Пазнаёміцца з праектам можна ў холе Віцебскага Успенскага сабора.

22 чэрвеня ў г. Полацку адбылося ўрачыстае адкрыццё Мемарыяльнага комплесу «Урочышча Пяскі», створанага на месцы масавага пахавання ахвяр фашызму, якія загінулі ў 1941–1944 гадах. Будаўніцтва комплексу падтрымалі жыхары розных рэгіёнаў Беларусі, а таксама жыхары нямецкага горада-пабраціма Фрыдрыхсхафена. Усе прысутныя сталі ўдзельнікамі музычна-тэатралізаванай кампазіцыі «Полацкая галгофа».

22 чэрвеня ў Бешанковічах у брацкай магіле, дзе пахаваны 198 воінаў, былі пахаваны астанкі яшчэ 11 салдат Вялікай Айчыннай вайны. Патрыятычная акцыя «Свечка памяці» адбылася каля ўсіх брацкіх магіл і помнікаў раёна.

22 чэрвеня ў Гарадку ва ўрочышчы Вераб’ёвы горы адбылася цырымонія пахавання астанкаў мірных жыхароў – ахвяр вайны. Мемарыял на месцы расстрэлаў 2 тысяч мірных грамадзян быў абноўлены да 75-годдзя Перамогі: устаноўлены мемарыяльныя пліты, інфармацыйныя стэнды з картай спаленых вёсак, інфармацыяй пра гета і лагер ваеннапалонных, высаджана рабінавая Алея Памяці.

Айчыннай вайны. Работа па яе аднаўленні заняла пятнаццаць гадоў. Таксама быў закладзены «Сад Перамогі».

Напярэдадні Дня Перамогі ў Сянно была адкрыта памятная таблічка на помніку ахвярам фашызму на брацкай магіле, дзе пахаваны салдаты Чырвонай Арміі, удзельнікі супраціўлення, расстраляныя фашыстамі мірныя жыхары.

З **5** да **10 мая** ля памятнага знака на месцы казні савецкіх патрыётаў ў гады нямецка-фашысцкай акупацыі па ініцыятыве Віцебскага абласнога краязнаўчага музея адбылася акцыя-рэквіем «Зажжем свечу памяти». Былі падрыхтаваны стэнды з фотаздымкамі ваенных помнікаў у Віцебску і дакументы пра гісторыю горада ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

6 мая ў аграгарадку Копці на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу імя Ленінскага камсамола адбылося ўрачыстае адкрыццё стэлы «Белыя жураўлі», прысвечанай загінуўшым воінам Чырвонай Арміі. На 17 мемарыяльных плітах высечаны імёны 1290 воінаў.

7 мая ў в. Новыя Вайханы Гарадоцкага раёна на вайсковых могілках, дзе пахаваны 3193 салдаты Вялікай Айчыннай вайны, была закладзена Алея Славы, пасаджана каля 30 дрэў.

8 мая ў Гарадку на вуліцы Баграмяна адбылося адкрыццё Алеі Славы Герояў Савецкага Саюза. У алеі пад чырвонымі зоркамі змешчаны фотаздымкі дванаццаці ўраджэнцаў Гарадоччыны, сярод якіх Героі Савецкага Саюза і поўныя кавалеры ордэна Славы.

Напярэдадні 75-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне Бабініцкай СШ Віцебскага раёна было прысвоена імя Героя Савецкага Саюза Ягора Васільевіча Васілеўскага. Адбылася ўрачыстая цырымонія з нагоды ўсталявання на будынку школы мемарыяльных дошак ураджэнцам Бабініцкага сельсавета, Героям Савецкага Саюза Ягору Васілеўскаму і Уладзіміру Курыленку.

15 мая ў Оршы на доме № 22 па 1-м Аўражным завулку адкрылі мемарыяльную дошку герою-земляку, поўнаму кавалеру ордэна Славы Пятру Касцюковічу.

У аг. Лукомль Чашніцкага раёна ладзілі адзін з цікавых і каларытных абрадаў, які называецца «Розгары» і праводзіцца на восьмы дзень пасля свята Тройцы. Удзельнікі фальклорнага калектыву «Вяскоўцы» Лукомльскага СДК перанялі традыцыю правядзення абраду ад мясцовых старажылаў. У гэтым годзе да лукамчан далучыліся загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Таццяна Валодзіна і старэйшы навуковы супрацоўнік гэтага аддзела Таццяна Кухаронак. (*Чырвоны прамень. – 2020. – 23 чэрв. – С. 5.*)

У чэрвені ў Багушэўскім гарпасялковым Доме культуры Сенненскага раёна прайшоў вусны часопіс «По дорогам памяти». Супрацоўнікі Ходцаўскага сельскага Дома культуры арганізавалі клубную сустрэчу з былым малалетнім вязнем Віктарам Сімановічам «Об этом не вспомнить нельзя».

9 творчых дуэтаў з Віцебскага раёна і г. Віцебска прынялі ўдзел у фінальным туры конкурсу вакальных дуэтаў «Во славу Победы», які **ў чэрвені** прайшоў у аг. Акцябрская ў рамках праекта «Пока свеча горит, мы помним», прысвечанага 75-годдзю Вялікай Перамогі.

У красавіку-маі ў Анапе праходзіў літаратурны конкурс «Память сердца», прысвечаны 75-годдзю Вялікай Перамогі. Удзельнік народнага клуба самадзейных паэтаў «Вдохновение» Расонскага раённага Цэнтра культуры і народнай творчасці Надзея Кожар прызнана лепшай у намінацыі «Проза».

БІБЛІЯТЭЧНАЯ СПРАВА

ДУ «Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна»

Красавік

Па выніках работы XII Міжнароднай школы якасці, якая прайшла ў 2019 годзе па ініцыятыве Пскоўскай абласной універсальнай навуковай бібліятэкі, пры ўдзеле кіраўнікоў і спецыялістаў Віцебскай абласной

бібліятэкі і публічных бібліятэк Віцебскай вобласці выдадзены зборнік дакладаў яе ўдзельнікаў.

Аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі падрыхтавана чарговая электронная выстава «Трывожны спеў жыцця»: паэтычная спадчына Уладзіміра Караткевіча з цыкла выстаў «“Я імгненне жыву, і памру на імгненне, і ў думцы і ў слове маім аджыву”: да 90-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча».

Падведзены вынікі абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу «Бібліятэка – асяродак нацыянальнай культуры» за 2019 год. Журы вызначыла наступных пераможцаў:

– у намінацыі «За значны ўклад у выхаваўчую работу з падрастаючым пакаленнем» – аддзел па рабоце з дзецьмі Лёзненскай цэнтральнай раённай бібліятэкі ДУК «Лёзненская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

– у намінацыі «За пошукавую і даследчую працу» – Цэнтральная бібліятэка імя А. С. Пушкіна ДУК «Аршанская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма» і Сасноўская сельская бібліятэка ДУК «Віцебская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»;

– у намінацыі «За падтрымку і развіццё чытання» – бібліятэка-філіял № 6 імя У. Караткевіча ДУК «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Наваполацка.

Супрацоўнікі электроннай чытальнай залы падрыхтавалі віртуальную кніжную выставу «Публикация одного памятника».

Сектар замежнай літаратуры прапанаваў выставу «Экзамен по иностранным языкам: тесты, тренажеры и лучшие методики».

Аддзел «Публічны цэнтр прававой інфармацыі» падрыхтаваў інфармацыйны дайджэст «Змяненні ў Працоўным кодэксе Рэспублікі Беларусь» з серыі «Дзяржаўны саветнік».

Супрацоўнікі электроннай чытальнай залы падрыхтавалі анлайн-выставу «Литературные маски Бориса Акунина».

родному слову» (Музей беларускага кнігадрукавання). «Дзень музеяў-2020» НПГКМЗ таксама правёў у віртуальнай прасторы. Трансляцыя пачалася **16 мая** на афіцыйным сайце і ў сацыяльных сетках. Супрацоўнікі аддзела фондаў падрыхтавалі відэапаштоўку «Правітанне з Полацка». Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер’я прапанаваў відэаролік «Традыцыйная драўляная цацка Паазер’я» і майстар-клас па вырабе саламянага павука «Павучок йдзе – шчасце вядзе». Адбылася відэапрэзентацыя праекта Мастацкай галерэі «Гравёрная майстэрня запрашае!» і многае іншае. Завяршыўся Дзень музеяў канцэртам у Сафійскім саборы «А музыка чароўная гучыць…». (*Полацкі веснік. – 2020. – 29 мая. – С. 7.*)

***

4 мая на Ушаччыне завяршыўся абласны этап міжнароднай акцыі «Во славу общей Победы» . На мемарыяльным комплексе «Прарыў» адбыўся мітынг-рэквіем і перадача капсул з зямлёй з вайсковых пахаванняў Віцебшчыны для залажэння ў крыпту храма-помніка ў гонар Усіх Святых.

9 мая Дубровеншчына разам з усёй краінай святкавала 75-годдзе Вялікай Перамогі. Галоўнай падзеяй гэтага дня стала адкрыццё пасля рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Рыленкі». Усталяваны 228 новых гранітных пліт, дзе ўвекавечана памяць 9402 савецкіх воінаў. У цырымоніі ўдзельнічалі кіраўнікі вобласці, прадстаўнікі абласных і раённых органаў улады, ветэранскіх арганізацый.

У маі на мемарыяльным комплексе Барок у Глыбоцкім раёне устанавілі новыя гранітныя пліты з імёнамі 435 ваеннапалонных, якія загінулі ў фашысцкім канцлагеры ў Беразвеччы.

У маі на адну з мемарыяльных пліт брацкай магілы ў Відзах Браслаўскага раёна нанесены імёны 28 раней безыменных байцоў.

У аграгарадку Опса Браслаўскага раёна ўрачыста адкрылі мемарыяльную скульптуру ў гонар землякоў, загінуўшых падчас Вялікай

месца), а таксама начальнік аддзялення паштовай сувязі Саколішчы Алена Вурганава (III месца).

Да Міжнароднага дня музеяў Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей арганізаваў выставу «Кирпич родного края» (з прыватнай калекцыі краязнаўцы С. П. Леаненкі) ля музейнай установы, выставу «Из истории музея» ў чытальнай зале раённай бібліятэкі, гарадскі квэст «Мой край – гордость моя» на сайце музея.

У чэрвені ў Віцебскім мастацкім музеі да святкавання 550-годдзя з'яўлення цудатворнай Жыровіцкай іконы Божай маці і 500-годдзя з дня заснавання Жыровіцкага манастыра прадстаўлена ўнікальная калекцыя ікон.

У чэрвені ў Шумілінскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі працавала выстава карцін юнай мастачкі Сашы Путры «Цудны збор карцін аднаго кароткага жыцця». Саша Путра пасмяротна ўзнагароджана Залатым медалём Хрыста Збавіцеля «За жыццё, дастойнае чалавека», ордэнам Святога Мікалая Угодніка «За памнажэнне дабрыні на зямлі».

У Віцебскім музеі гісторыі прыватнага калекцыяніравання **да 6 ліпеня** была арганізавана выстава «Маршалы Победы». Аўтар мініяцюр – кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт кафедры дызайну мастацка-графічнага факультэта ВДУ імя П. М. Машэрава Ігар Гарбуноў.

У чэрвені да Дня памяці і смутку супрацоўнікі Сенненскага гісторыка-краязнаўчага музея правялі квэст па старонках гісторыі Сенненшчыны, падзеях Вялікай Айчыннай вайны. У памяць пра загінуўшых землякоў супрацоўнікамі музея створаны відэаролік «Малітва», які размешчаны на сайце музея.

Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік прапанаваў сваім наведвальнікам віртуальныя выставы: фотавыстава «Иппосфера Великой Отечественной войны», фотавыстава Ігара Бышнёва «Чернобыльские джунгли», выстава «Живи, планета!» (Прыродна-экалагічны музей); выстава жывапісу Паўла і Уладзіміра Кандрусевічаў «Фигура», выстава «Лица войны» (Мастацкая галерэя); выстава «Служение

Супрацоўнікі аддзела літаратуры па мастацтве пазнаёмілі з віртуальнай выставай «Новыя паступленні: малюнак і дызайн», на якой прадстаўлены кнігі па тэорыі малюнка і дызайну розных відаў і накірункаў.

Аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі выдадзена інфармацыйнае паведамленне за I квартал 2020 года «Культурнае жыццё Віцебскай вобласці».

Да Міжнароднага дня цырка супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры падрыхтавалі выставу кніг «Але-ап».

Аддзел «Публічны цэнтр прававой інфармацыі» падрыхтаваў анатаваны бібліяграфічны спіс «Злачынства і пакаранне».

Аддзел эканамічнай, тэхнічнай і сельскагаспадарчай літаратуры прадставіў анлайн-выставу «Рэклама – палітра жанраў».

Нямецкая чытальная зала запрасіла ўсіх жадаючых здзейсніць падарожжа па федэральных землях Германіі на кніжнай выставе «Альтэрнатыўнае падарожжа па землях Германіі».

Супрацоўнікі Віцебскай абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна даслалі прывітанне расійскім калегам і чытачам – удзельнікам Усерасійскай штогадовай сацыяльна-культурнай акцыі «Библионочь-2020», тэма якой – 75-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

Супрацоўнікі аддзела літаратуры па мастацтве падрыхтавалі віртуальны агляд выдання «100 музеяў свету, якія неабходна ўбачыць».

Супрацоўнікі электроннай чытальнай залы падрыхтавалі вебліяграфічнае выданне «Вайна. Перамога. Памяць».

Май

Сектар замежнай літаратуры прапанаваў увазе карыстальнікаў анлайн-выставу «Пра Беларусь – на замежных мовах».

Да 75-годдзя Вялікай Перамогі карыстальнікаў бібліятэкі запрасілі да прагляду буктрэйлераў, створаных яе супрацоўнікамі па кнігах Сяргея Смірнова «Брэсцкая крэпасць», Івана Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага», Прыма Леві «Человек ли это?».

Сектар замежнай літаратуры падрыхтаваў агляд новых паступленняў літаратуры пра Вялікую Айчынную вайну «Памяць пра вайну нам кнігі пакідаюць…».

Агульная чытальная зала падрыхтавала анлайн-выставу «Вялікія палкаводцы Вялікай Айчыннай вайны» і электронную прэзентацыю кніг «Вялікай Перамозе прысвячаецца…».

Аддзел перыядычных выданняў прапанаваў увазе карыстальнікаў віртуальную выставу «Невядомая праўда вайны», падрыхтаваную па матэрыялах тэматычных дадаткаў гістарычнага навукова-папулярнага часопіса «Радзіма».

Да 75-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне аддзел краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі падрыхтаваў анатаваны спіс выданняў «Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны».

Да Міжнароднага дня сям'і супрацоўнікамі аддзела дзіцячай літаратуры быў падрыхтаваны віртуальны агляд кніг «Семь Я».

У бібліятэцы адкрыты бясплатны доступ да электроннага інфармацыйнага рэсурсу «ASTM Compass Abstrakt» кампаніі ASTM International, якая з'яўляецца адным з вядучых распрацоўшчыкаў і выдаўцоў міжнародных стандартаў. Тэставы доступ адкрыты да 31 снежня 2022 года.

Віцебская абласная бібліятэка далучылася да чэленджу #ЧытаемРазам, у якім бібліятэкары рэкамендуюць свае любімыя кнігі.

Увазе карыстальнікаў бібліятэкі быў прадстаўлены віртуальны агляд кнігі «Забава. Народная цацка і лялька Віцебшчыны».

21 мая ў бібліятэцы адкрылася выстава работ «Нечаканае». Аўтар – дацэнт кафедры дызайну і моды УА «ВДТУ» Таццяна Макляцова.

Аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі падрыхтавана чарговая электронная выстава «Абліччы мінулага: асаблівасці нацыянальнай гісторыі ў прозе Уладзіміра Караткевіча» з цыкла выстаў «"Я імгненне жыву, і памру на імгненне, і ў думцы і ў слове маім аджыву": да 90-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча.

У маі–ліпені да 75-годдзя Перамогі ў музеі драўлянай скульптуры рэзчыка С. С. Шаўрова ў г. Оршы была арганізавана міні-выстава плакатаў «И кисть с врагом сражалась».

75-годдзю Вялікай Перамогі была прысвечана выстава эстампаў у Талачынскім гісторыка-краязнаўчым музеі. Работы створаны ў 70-х гадах мінулага стагоддзя майстрамі – прадстаўнікамі былых рэспублік СССР.

У маі прайшлі грамадскія абмеркаванні па архітэктурна-планіровачнай канцэпцыі будынка Мемарыяльнага музея Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава ў Оршы, экспазіцыя якога часова размешчана на выставачнай пляцоўцы музея гісторыі і культуры Аршаншчыны. Аўтар праекта – архітэктар Яўген Ткачоў.

16 мая Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў правяло «Ноч музеяў» у анлайн-фармаце. Адбылася прамая трансляцыя з музея традыцыйнай культуры: экскурсія па выставе фатографа Альфрэда Мікуса, адкрыццё экспазіцыі мастачкі Аліны Трукан «Мае сны», майстар-клас па вырабе саламяных упрыгожанняў.

16 мая ў Сенненскім гісторыка-краязнаўчым музеі адбылася сустрэча з членам абласнога аргкамітэта па ўвекавечанні памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў, кіраўніком Віцебскага рэгіянальнага цэнтра героіка-патрыятычнага выхавання «Пошук» Ларысай Бруевай і актыўным удзельнікам акцыі «Вахта памяці» Мікалаем Бабянком.

18 мая Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей далучыўся да акцыі «Ноч музеяў» у віртуальным фармаце на сайце музея і афіцыйных старонках у сацыяльных сетках. Былі прадстаўлены рэтраспектыўны відэаагляд «Ночь музеев в Глубоком», інтэлектуальная бліц-гульня «Пазл музейных событий».

18 мая ў Міжнародны дзень музеяў супрацоўнікі Расонскага Музея баявой садружнасці правялі завочны квэст «История музея боевого содружества: даты, события, люди». Заданне было размешчана на старонцы музея ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте». Пераможцамі сталі навучэнцы Клясціцкай школы Вераніка Белавусава (I месца) і Ксенія Бышчава (II

З 21 красавіка да 12 чэрвеня да 75-годдзя Перамогі Шумілінскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей праводзіў інтэрнэт-фотаконкурс патрыятычнай фатаграфіі «Живая память сердца». Фотаработы размешчаны на старонцы музея ў сацыяльнай сетцы «Аднакласнікі».

24 красавіка ў музеі гісторыі і культуры г. Наваполацка адкрылася выстава «Окна сатиры». Гэта другі сумесны праект наваполацкіх музейшчыкаў і работнікаў Музея Перамогі (г. Масква).

Да 75-годдзя Перамогі Шумілінскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей праводзіў конкурс-віктарыну «1418 дней и ночей к Победе». Пытанні віктарыны размяшчаліся на сайце газеты «Герой працы».

Да 75-годдзя Перамогі Шумілінскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей сумесна з раённай арганізацыяй Беларускага фонду міру, раённым камітэтам БРСМ абвясціў акцыю «Почта Победы».

З **1 мая** Віцебскі абласны краязнаўчы музей аб'явіў акцыю «И в памяти, и в семейном альбоме», прысвечаную 75-годдзю Вялікай Перамогі. Жыхарам Віцебшчыны прапанавана падзяліцца фотаздымкамі і гісторыямі пра баявы і працоўны шлях сваіх родных – удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны.

Да 75-годдзя Вялікай Перамогі Музей баявой славы г. Полацка абнавіў экспазіцыю. Увазе наведвальнікаў прадстаўлены выставы «Полоцкий фотоальбом. 1941–1947 гг.» і «За мужество и героизм… Награды Великой Победы».

9 мая ў Сенненскім раённым краязнаўчым музеі адкрылася выстава «У памяць пра вайну». На выставе шмат арыгінальных экспанатаў, змешчаны рэчы, якімі карысталіся салдаты, баявая амуніцыя чырвонаармейцаў, трафейныя рэчы.

У маі–ліпені на афіцыйным сайце Глыбоцкага гісторыка-этнаграфічнага музея прадстаўлена віртуальная выстава «Вясна 45-га года». На выставе змешчаны ўнікальныя франтавыя фатаграфіі, а таксама пасведчанні да ўзнагарод і ўзнагародныя лісты, якімі былі адзначаны землякі.

У рамках бібліятэчнага праекта «Разам!» сумесна з аддзяленнем дзённага знаходжання для грамадзян сталага ўзросту ДУ «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Чыгуначнага раёна г. Віцебска» быў прадстаўлены аўдыяспектакль «Дык вось ён які, чалавек!».

Інфармацыйна-бібліяграфічным аддзелам падрыхтаваны анатаваны бібліяграфічны спіс літаратуры «Открой свою дверь: профессиональная ориентация».

Аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі быў выдадзены каталог «Аляксандр Салаўёў. Інтуіцыя творчасці».

Супрацоўнікі аддзела дзіцячай літаратуры ў сувязі з пачаткам летніх канікулаў зрабілі віртуальны агляд кніг «Числа в книгах».

Інфармацыйна-бібліяграфічным аддзелам падрыхтаваны анатаваны бібліяграфічны спіс «Источники вдохновения: эстетическое воспитание личности».

Чэрвень

Нямецкая чытальная зала прадставіла выставу твораў дзіцячых нямецкіх пісьменнікаў «Лета для чытання: кнігі, якія хочацца прачытаць».

Аддзелам краязнаўчай літаратуры і бібліяграфіі быў выдадзены інфармацыйны дайджэст «Евреи на Витебщине».

Аддзел «Публічны цэнтр прававой інфармацыі» прадставіў інфармацыйна-тэматычны дапаможнік «Азбука выбаршчыка».

Агульная чытальная зала прапанавала наведаць анлайн-выставу «Святло праваслаўнай кнігі», на якой прадстаўлены найбольш значныя кнігі ў жыцці кожнага хрысціяніна.

26 лютага – 6 сакавіка адбылася XI Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Ярослав Мудрый. Проблемы изучения, сохранения и интерпретации историко-культурного наследия». Канферэнцыя праходзіла на дзвюх пляцоўках: на базе Цэнтральнай дзіцячай бібліятэкі імя Яраслава Мудрага (г. Яраслаўль, Расія) і на базе

